ГЕРОІ ДЗВІНСКАЙ ПЕРАПРАВЫ

гвардзейскай стралковай дывізіі, якая вельмі многае зрабіла пры вызваленні Бешанковіцкага раёна ад нямецкіх фашыстаў.

Камандзір батарэі

Павел Кавалёў нарадзіўся ў 1913 годзе ў пасёлку Нова-Сафіеўскі пад Смаленскам. Бацькі яго былі малазямельныя сяляне. Хлопчык з адзінаццаці гадоў пачаў працаваць — пасвіў жывёлу ў кулакоў. Толькі пачатковую школу закончыў ён. Так, напэўна, і застаўся б з чатырма класамі адукацыі,калі б не вялікія пераўтварэнні, якія адбыліся ў вёсцы. Бацькі ўступілі ў калгас, а 16-гадовы Павел паступіў працаваць у дэпо станцыі Смаленск.

Кемлівы юнак хутка атрымаў спецыяльнасць слесара. Адначасова вучыўся на рабфаку. Безумоўна, працаваць і вучыцца было цяжка, але Кавалёў пераадолеў усе гэтыя цяжкасці. Восенню 1935 года яго прызвалі ў рады Савецкай Арміі,вучыўся ў палкавой школе, а потым застаўся на звыштэрміновай службе. У 1939 годзе закончыў школу малодшых лейтэнантаў і быў прызначан камандзірам узвода. Служыў малады афіцэр у артылерыі. Праз два гады стаў камандзірам батарэі. Баявое хрышчэнне лейтэнант Кавалёў атрымаў ля Брэста. Перанёс ён цяжкасці адступлення, ваяваў пад Ленінградам і Курскам. За гады вайны быў сем разоў паранены, з якіх чатыры разы — цяжка.

Летам 1944 года гвардыі старшы лейтэнант Кавалёў служыў у Павел Кавалёў быў камандзірам батарэі. Дывізія фарсіравала Заходнюю Дзвіну ля вёскі Узрэчча. Стралковыя падраздзяленні, а сумесна з імі і артылерысты 24 чэрвеня 1944 года падыйшлі да ракі. Калі пяхота пачала фарсіраваць раку, артылерысты прыкрывалі яе агнём з гармат. А 25 чэрвеня артылерысты пачалі перапраўляць гарматы на левы бераг Дзвіны. Пантонаў і парома не аказалася. Артылерысты і сапёры зрабілі вялікі плыт. Для большай устойлівасці да яго бакоў прымацавалі пустыя жалезныя бочкі. На такім плыце па чарзе былі перапраўлены на левы бераг усе чатыры гарматы, а потым і аўтамашыны-цегачы. Артылерысты адразу ўступілі ў бой. За кароткі час яны знішчылі пяць кулямётных кропак і больш дваццаці гітлераўцаў.

Але самае цяжкае было ўперадзе. Пачаліся контратакі ворагаў. Іх было многа. Часта мяняючы агнявыя пазіцыі, разлікі батарэі заставаліся ў цэласці. Камбат знаходзіўся ля разлікаў,знаходзіў цэлі, атрымліваў даныя ад камандзіраў стралковых узводаў і рот.У гэтым баі артылерысты падбілі чатыры цегачы,якія перавозілі мінамёты, і цягач з двума вялікімі гарматамі.

За смеласць і адвагу, умелае камандаванне батарэяй Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў гвардыі старшаму лейтэнанту Паўлу Сцяпанавічу Кавалёву званне Героя Савецкага Саюза.

Службу ў Савецкай Арміі П. С. Кавалёў працягваў да 1957 года. Ён многае зрабіў для выхавання маладога папаўнення, перадаючы яму вопыт Вялікай Айчыннай вайны. Герой жыве ў Растове-на-Доне. Працаваў механікам у аўтагаспадарцы. Цяпер — персанальны пенсіянер.

П. ФРАЛОЎ.

...амяці воінаў

вецкага народа, аб людзях, якія вызвалялі раён, аб загінуўшых Героях, якія засталіся ляжаць на нашай зямлі,гаварыў прамоўца.

На здымку: ускладанне вянкоў да помніка загінуўшым.

Фота У. ПАРАМОНАВА.